www.nv-online.info

Народная Воля

№ 13 (3754)

15 лютага 2013 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Прабачце, калі ласка, Валянцін Алегавіч!

У мінулым нумары "Народнай Волі" на гэтым месцы была надрукавана карэспандэнцыя пад загалоўкам "Як пралічыўся Сукала...". Дзеля справядлівасці скажам: пралічыўся не старшыня Вярхоўнага суда, пралічылася аўтарка матэрыялу Ірына Мальцава. У першую чаргу з-за яе недагляду двойчы няправільна падаецца імя кіраўніка ВС Рэспублікі Беларусь. На жаль, і само апаніраванне мае хібы. Лічбы, якія ўзяты з інтэрв'ю Валянціна Алегавіча "Советской Белоруссии", тычацца выключна папраўчых устаноў, а апаненты бяруць шырэй — усе месцы пазбаўлення волі. А гэта, як кажуць у Адэсе, дзве вялікія розніцы.

Кіруючыся прынцыпам аб'ектыўнай падачы інфармацыі, правам, прадастаўленым заканадаўствам, рэдакцыя газеты "Народная Воля" не толькі выпраўляе дапушчаныя недакладнасці, але і **прыносіць прабачэнне старшыні Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь Валянціну Алегавічу Сукалу.** Зроблены адпаведныя захады па больш уважлівым падыходзе пры падрыхтоўцы матэрыялаў, павышэнні адказнасці журналістаў, карэктараў на ўсіх этапах работы над публікацыямі.

Рэдакцыя газеты "Народная Воля".

Жах!

У Гомелі цэлая вуліца жыве як у сярэднявеччы: з выгод — толькі дах над галавой, але і той дзіравы...

Падрабязнасці гомельскіх жахаў — на 2-й паласе.

У НУМАР!

Ірыне Халіп дазволілі спатканне з мужам Андрэем Саннікавым

Жонцы былога кандыдата ў прэзідэнты дазволілі часовы выезд з Беларусі.

"Пазаўчора мяне выклікалі ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю Партызанскага РУУС, дзе я стаю на ўліку. Начальнік Наталля Каляда паведаміла мне, што па маёй заяве ўсё ж такі прынята станоўчае рашэнне і ў перыяд да 3 красавіка я магу наведаць мужа і з'ездзіць у рэдакцыю "Новой газеты", — *паведаміла Ірына Халіп.* — Гэта значыць, нам з мужам далі "свіданку". Вядома, спатканне ў Еўропе куды лепш, чым спатканне ў Наваполацкай калоніі, але ў маім статусе нічога не мяняецца. Я па-ранейшаму застаюся арыштанткай, у ліпені мяне чакае новы суд, які будзе вырашаць, што са мной рабіць далей. Проста падчас дзвюх дазволеных мне паездак міліцыя не будзе прыходзіць да мяне па вечарах. А так — усё застаецца па-ранейшаму: адзначэнне ў РУУС кожны панядзелак, каменданцкая гадзіна ў 22.00, начныя візіты міліцыі з праверкамі".

Журналістка "Новой газеты" задаецца пытаннем: чаму яе часова адпусцілі з краіны?

"Чаму ў рэжыму раптам "канцэпцыя змянілася", здавалася б? Бо яшчэ ў канцы кастрычніка, пасля першай заявы Лукашэнкі, мой галоўны рэдактар **Дзмітрый Муратаў** прыехаў у Мінск і прыйшоў у тую ж самую крымінальна-выканаўчую інспекцыю, — *адзначыла Ірына Халіп.* — І тая ж начальніца падрабязна патлумачыла яму, што ні пра якую паездку ў Маскву гаворкі быць не можа. А ўчора раптам усё вырашылася на працягу некалькіх хвілін. І я ўпэўнена: сустрэча з мужам стала магчымай дзякуючы журналістам. Спачатку **Яўген Лебедзеў** з The Independent, потым **Таццяна Каравянкова** з БелаПАН, якія задавалі Лукашэнку нязручныя пытанні, змаглі "разгайдаць" сітуацыю. І тыя, хто падхопліваў тэму, тэлефанаваў у афіцыйныя інстанцыі, патрабуючы тлумачэнняў, прымусілі лукашэнкаўскую чэлядзь круціцца, быццам вужы на патэльні. Так што я вельмі ўдзячная сваім калегам. Менавіта дзякуючы ім, а не раптоўнаму прыпадку гуманнасці ў гэбухі і яе начальства, я атрымала магчымасць хоць бы на некалькі дзён убачыцца з мужам.

У той жа час я выдатна разумею, што журналісты маглі б біцца ў любыя дзверы безвынікова, але менавіта зараз, як усе мы бачым, пачаўся чарговы этап гандлю. Нас усіх выставілі на таргі ў абмен на крэдыты, "Усходняе партнёрства", адмену санкцый. І я не сумняваюся, што прадастаўленае мне кароткае спатканне з мужам будзе падавацца лукашэнкаўскімі эмісарамі як разгул дэмакратыі. Вельмі спадзяюся, што ў заходніх палітыкаў хопіць мудрасці не клюнуць на гэтую прынаду".

СУД

Андрэй ЗАБАБУРА: «Я не забойца!»

Сёння ў судзе Фрунзенскага раёна сталіцы прагучыць прысуд у гучнай справе супраць кіроўцы "Porshe", які летась 13 кастрычніка літаральна ля будынка школы збіў насмерць 9-гадовага Улада Грудзьева.

Пракурор папрасіў пакараць кіроўцу абмежаваннем волі на чатыры гады. Адвакат — апраўдаць, бо, на яго думку, няма віны вадзіцеля ў тым, што школу не агарадзілі, знакі няўклюдна расставілі, ліхтары амаль не свецяць.

Андрэй Забабура, у якога двое непаўналетніх дзяцей і цяжарная жонка, сказаў, што плакаў толькі два разы ў жыцці — калі памёр ягоны бацька і калі выцягваў з-пад колаў свайго аўто загінуўшага хлопчыка.

"*Мой лёс і лёс загінуўшага хлопчыка перапляліся нейкім жахлівым, трагічным чынам,* — сказаў Забабура ў сваім апошнім слове. — *Такія раны застаюцца на ўсё жыццё. Тры гады таму ў мяне памёр бацька. Тады мяне рэгулярна наведвалі суіцыдальныя думкі. Але час лечыць. Мой бацька вучыў нас не плакаць, але я не мог стрымаць слёз, калі адбылося гэта жудаснае ДТЗ. Я прашу прабачэння ў мамы, у бабулі і дзядулі загінуўшага дзіцяці. Я прызнаю сваю маральную віну і гатовы аказваць дапамогу маці хлопчыка незалежна ад таго, якім будзе рашэнне суда. Але тыя, хто бачыць ува мне злачынцу, які заехаў на тэрыторыю школы з намерам збіць да смерці хлапчука, яны не правы. Гэтая трагедыя выклікала грамадскі рэзананс. Вы чыталі форумы, што там было напісана пра мяне. Адны заклікалі спаліць мяне жыўцом разам з аўтамабілем, іншыя — пасадзіць на кол, пераследаваць маю сям'ю".*

Тым часам адвакат Забабуры папрасіў суд падрыхтаваць прадстаўленне ў органы адукацыі на прадмет арганізацыі кантролю за дзецьмі, бо трагедыя адбылася ля навучальнай установы.

Любоў ЛУНЁВА.

З-ЗА КРАТАЎ

Алеся Бяляцкага пазбавілі спатканняў

Праваабаронца пазбаўлены спатканняў, якія ён мусіў атрымаць у бліжэйшыя паўгода. Гэтую інфармацыю 13 лютага пацвердзіла адміністрацыя Бабруйскай калоніі №2, дзе ўтрымліваецца палітвязень.

У 2012 годзе зняволены кіраўнік зачыненага ўладамі ПЦ "Вясна" быў пазбаўлены аднаго кароткатэрміновага (з трох магчымых) і аднаго доўгатэрміновага (з двух магчымых) спатканняў з роднымі. Пра тое, што ў новым годзе ён пазбаўлены аднаго доўгатэрміновага спаткання, Алесю Бяляцкаму стала вядома 5 лютага, а раней яму паведамілі пра пазбаўленне кароткатэрміновага спаткання.

Такім чынам, наступнае "планавае" спатканне чакае Алеся Бяляцкага толькі ў жніўні.

Як паведамляе сайт "Вясны", праваабаронцы разглядаюць узмацненне ціску на Алеся Бяляцкага, як і на іншых палітвязняў, якія нядаўна заявілі пра гэта, як спробу ўлад дамагчыся ад іх прашэнняў аб памілаванні, што выклікана аднаўленнем перамоўных працэсаў паміж беларускімі ўладамі і Еўрапейскім Саюзам.

ПАД СЛЕДСТВАМ

Коні падвялі?

Следчы камітэт распачаў крымінальную справу ў дачыненні да былога генеральнага дырэктара Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі **Віктара Міхадзюка.**

Справу завялі пасля адпаведнай праверкі, якую сумесна наладзілі аж тры ведамствы — КДК, КДБ і МУС. Міхадзюка падазраюць у злоўжыванні ўладай і нанясенні матэрыяльнага ўрону ўстанове, якую ён узначальваў. Аднак пад варту Міхадзюка не бралі.

Вера ВІР.

БИЗНЕС-НОВОСТИ

Samsung прекратил поставки нетбуков в Беларусь

И прогнозирует в 2013 году рост продаж планшетов в 10 раз.

Об этом агентству "Бизнес-новости" сообщил руководитель IT-департамента представительства Samsung в Беларуси ***Алексей Голуб.***

"*Объемы продаж наших планшетов линейки Galaxy выросли в прошлом году примерно в 10 раз по сравнению с 2011 годом. Первые месяцы этого года показывают, что рынок в 2013 году может вырасти еще в 10 раз",* — цитирует Голуба сайт doingbusiness.by.

Он затруднился оценить объем белорусского рынка планшетов, отметив, что планшеты активно вытесняют с рынка нетбуки и недорогие ноутбуки (стоимостью до 500 долларов).

"Основные производители нетбуков уже прекратили их выпуск. С января этого года компания Samsung прекратила поставки нетбуков в Беларусь. Сейчас распродаются товарные остатки", — отметил Голуб.

АКТУАЛЬНАЯ ТЕМА

Полную стоимость электроэнергии будем оплачивать к 2016 году

Об этом сообщил журналистам заместитель генерального директора по сбыту энергии РУП "Минскэнерго" ***Юрий Мишук.***

Юрий Мишук отметил, что в Беларуси самые низкие тарифы на электроэнергию для населения по сравнению со всеми соседними странами.

"У нас существует перекрестное субсидирование, при котором предприятия покрывают затраты на электроэнергию, недоплаченные населением. Эта система неправильна, от нее во всем мире уходят", — приводит belta.by слова чиновника.

По его словам, с 1 февраля белорусы оплачивают электроэнергию по цене в среднем около 4 центов США/кВтч при ее себестоимости чуть меньше 10 центов США/кВтч. Таким образом, население возмещает менее 50% затрат энергоснабжающих организаций на производство и доставку электроэнергии потребителю.

"Со временем предприятия будут все меньше платить за электроэнергию, а к 2016 году население будет оплачивать полную ее себестоимость, — подчеркнул он. — *Это справедливо, поскольку условия оплаты электроэнергии на протяжении многих лет были очень лояльными для населения. В то же время одномоментно повышать оплату электроэнергии до уровня ее себестоимости, конечно, неправильно".*

Заместитель гендиректора также поделился способами экономии электроэнергии в быту. Так, по его словам, энергосберегающие лампочки по сроку служ-бы заменяют 5 лампочек накаливания. Экономия от этой замены существенная — около 40—50% в зависимости от интенсивности их использования. Среди других путей энергосбережения — своевременная замена фильтров в пылесосе, рациональное использование пространства холодильника.

ПО ПОВОДУ

Мария ЭЙСМОНТ

Поддержка или подножка?

Разумна ли политика государства, в котором функционирует социальная программа по льготному строительству жилья? Ведь понятно, что часть квартир на этих условиях построят те, кто к категории льготников не имеет отношения. В любой стране найдутся изобретательные граждане, которые придумают различные схемы и обзаведутся новым жильем, используя льготные кредиты. А те, для кого эти программы писались, будут по-прежнему жить в общежитиях и десятилетиями стоять в очереди на строительство льготного жилья. Хотя, безусловно, до кого-то эта очередь и дойдет.

В Беларуси сейчас развернута активная борьба с мошенниками. Грозятся отобрать квартиры у тех, кто их построил на льготных условиях, но там не живет. Раз не живет — значит, и не нуждался. Люди спешно выселяют квартирантов, которым сдавали построенные квартиры (зачастую, чтобы рассчитаться с кредитами) и въезжают сами. Стоимость аренды жилья поползла вверх и достигла немыслимых пределов. На окраине Минска за однокомнатную квартиру просят 400 долларов.

Власти программу господдержки при строительстве не свернули, но пересмотрели. Заявили, что теперь помогать будут только самым нуждающимся. И, конечно, в первую очередь многодетным семьям. И условия для них сохранили прежние, кредиты выдают под 1% годовых на 40 лет. Но Совмин в конце прошлого года принял постановление "О мерах по выполнению задач на 2013 год по строительству жилых домов" и определил цену квадратного метра в 4,6 миллиона рублей, исходя из которой рассчитывается цена всей квартиры и выдается льготный кредит. Получается, что если в эту сумму не вписываешься, разницу погашай как хочешь, на "лишнюю" сумму льготный кредит не выдают. И первый прецедент уже создан.

В прошлом году в небольшом поселке Белыничи Могилевской области местные власти проявили заботу о многодетных семьях и сами инициировали создание жилого кооператива для 12 многодетных семей. Обещали, что с финансированием проблем не будет и уже в декабре 2012 года семьи справят новоселье. Но в декабре только начали рыть котлован под новый дом. А в январе 2013 года пересмотрели смету и посчитали, что стоимость одного квадратного метра в этом доме возросла с 6,4 миллиона до 7,9. Но льготный кредит с учетом нового правительственного постановления будет выдаваться только на сумму, которая считается исходя из стоимости одного квадрата — 4,6 миллиона. Т.е. если квартира 100 квадратных метров, то 330 миллионов рублей многодетной семье придется доплатить безо всякого льготного кредитования. Ищите, как говорится, где хотите.

Многодетные семьи жить в таком дорогом доме не хотят. Они говорят: стройте дом поскромнее, чтобы 1 квадратный метр стоил 4,6 миллиона, как определил Совмин для льготного кредитования. Им отвечают: мол, нет, дешевле нельзя, так сегодня стоят стройматериалы, к тому же дом небольшой, только на 12 квартир, и это удорожает строительство. Семьи настаивают: под Минском в Боровлянах, где земля в разы дороже, чем в Белыничах, квадратный метр в кирпичном доме стоит 930 долларов. У них — 900. Да что в Минске! Под боком, в Белыничах, строится обычный дом безо всякой господдержки, и там цена квартиры равняется той доплате, которую требуют с многодетных семей. "Что ж это за забота о многодетных семьях такая?" — справедливо возмущаются члены кооператива.

В январе в ситуацию якобы вмешался вице-премьер Калинин и дал распоряжение льготно кредитовать суммы, исходя из стоимости одного квадратного метра — 7,9 миллиона. Членов кооператива собрали в местном исполкоме, и глава района предложил пока взять кредит на сумму, исходя из стоимости метра — 4,6 миллиона. Остальную сумму обещают выдать потом на таких же льготных кредитных условиях. Но распоряжение это устное, а в нашей стране без бумажки ты — букашка. И многодетные семьи поначалу отказались от такого предложения.

Но, отказавшись от кредита, они могут остаться без новых квартир. Ведь строительство дома уже начато, почти три этажа воздвигнуты за деньги строительной организации — местного ПМК. И если члены кооператива не начнут возвращать деньги, строительство могут заморозить или найти других желающих обзавестись квартирой в этом доме. Поэтому часть многодетных семей решила не рисковать и начала оформлять льготный кредит на сумму, исходя из стоимости одного квадратного метра 4,6 миллиона.

На что они надеются? Что власти их не обманут и кредитную линию им увеличат? В какой-то степени да. А еще юристы им подсказали ход: главное — зацепиться за строительство, довести его до конца, а позже можно будет через суд добиваться своих законных прав — обещанных государством льгот при строительстве жилья многодетным семьям. Они, конечно, надеются, что до суда дело не дойдет. Ведь так всегда: нам кажется, что с нами ничего такого не случится, что всякие там страшные истории — это не про нас. Но, к сожалению, историй, когда власти слово давали, а потом его забирали, в современной Беларуси полно. Но... Посмотрим, как разрешится эта ситуация.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2013 г.

ЖАХ!

У трушчобах...

Нават карэнныя жыхары Гомеля не адразу скажуць, дзе знаходзіцца вуліца 1-я Праезная, хоць месціцца яна каля папулярнага Прудкоўскага кірмашу. Гарадскія ўлады пад страхам смерці не павязуць сюды гасцей — у дамах няма ні вады, ні прыбіральняў, а шпалеры адвальваюцца з-за цвілі і вільгаці...

М і Ж

Дарога ад кірмашу да квартальчыка з прыватнай забудовай і баракамі — брудная, разбітая машынамі. 1-ю Праезную з аднаго боку хавае рака, з другога — прыватныя дамы. Прысадзістыя, іржавага колеру двухпавярхоўкі не адразу кідаюцца ў вочы. Прызнацца шчыра, для драматычнага рэпартажа пахмурны лютаўскі дзень падыходзіць проста выдатна. З шэрым нячышчаным мокрым снегам і паўразваленымі гаспадарчымі пабудовамі вуліца нагадвае дэкарацыю да фільма пра вайну. Пра блакадны Ленінград, напрыклад. У XXI стагоддзе вяртаюць гурбы пэт-бутэлек з-пад піва, што валяюцца ўздоўж плота.

На вуліцы пуста. Знешне 1-я Праезная магла б прэтэндаваць на статус закінутай, калі б не свежая фарба колеру "вырві вока" на дзвярах цаглянага будыначка і тоўстыя мясцовыя коцікі. Пры бліжэйшым разглядзе аказалася, што цагляны хляўчук без апазнавальных знакаў — прыбіральня дома №13. У кватэрах па ўсёй вуліцы няма ні вады, ні туалетаў. У вулічных "выгодах" усё па-спартанску — мужчынская і жаночая паловы раздзелены паміж сабою тонкай сценачкай. "Інтэр'ер" у абодвух кабінах ідэнтычны: дзірка ў падлозе і ржавае жалезнае вядро для смецця. Не хочацца ўяўляць, які пах стаіць тут улетку, калі слупкі тэрмометраў падымаюцца да 25—30 градусаў... Падобная карціна ля кожнага з шасці двухпавярховых дамоў. Розніца толькі ў матэрыяле, з якога выкананы "выгоды", — тут цэгла, там дошкі, але паўсюдна яркі зялёны колер. Каб было весялей?

Ні вады, ні акон — такі дом...

Жыхароў не відаць, таму працягваем агляд тэрыторыі без суправаджэння. Насупраць кожнага дома побач з прыбіральнямі стаяць, прылепленыя адна да адной, няўцямныя хібары з цэглы і дошак. Гэта хлявы, ці, як іх тут называюць, гаражы. На кожным — нумар кватэры, гаспадару якой хляўчук належыць. Каля аднаго з такіх будынчкаў мужчына чысціць снег. Аказваецца, гэта жыхар дома №3 — адзінага, дзе шэсць гадоў таму спрабавалі рабіць капітальны рамонт. Мужчына, назавём яго Іванам, пагаджаецца стаць Вергіліем для "Народнай Волі" і правесці нас па ўсіх кругах 1-й Праезнай.

"*Ужо ніхто з мясцовых жыхароў не скажа, калі дакладна пабудавалі гэтыя дамы*, — распавёў наш экскурсавод. — *Мусіць, гадоў 70 ім ужо... Жыць тут немагчыма: перакрыцці драўляныя, праводка старая, усё гнілое ўнутры, паўсюдна цвіль і вільгаць.*

Унутры няма ні прыбіральняў, ні вады. У моцныя маразы людзі па патрэбе ходзяць у вядро. Калі дамагчыся дазволу ад улад, можна самастойна правесці ў кватэры каналізацыю. Я за такі дазвол змагаўся 7 гадоў!

Хто мог, самастойна памяняў вокны на пластыкавыя, але не ўсім даходы дазваляюць. Капітальны рамонт за апошнія дзесяцігоддзі спрабавалі рабіць толькі ў нашым доме. Таму звонку ён выглядае лепш, чым астатнія, — тынкоўка свежая, уцепленыя сцены. Але рамы мянялі толькі знутры, знешне яны так і засталіся..."

Іван паказвае каналізацыю, якую выкапалі побач з яго пад'ездам за грошы жыхароў. Бетонная пліта і жалезныя дзверы на адным узроўні з дарогай. Пліта хістаецца. Дзецям вельмі строга забаронена гуляць каля гэтага месца.

Сам сабе пажарны, сам сабе электрык

Іван вядзе нас у кватэру свайго таварыша ў суседні дом. Насуперак міфу аб тым, што праблемы з жыллём могуць быць толькі ў пенсіянераў ці маргіналаў, сведчу: жывуць на 1-й Праезнай самыя звычайныя людзі. І тое, што праблемы тут для ўсіх аднолькавыя, нам яшчэ раз нагадваюць у кватэры будаўніка Аляксандра, што жыве на першым паверсе. Малады мужчына паказвае месцамі аблупленыя шпалеры і тлумачыць: з-за вільгаці няма сэнсу пераклейваць. Там, дзе вільгаць, там і цвіль, таму фарба на падаконніку таксама трымаецца нядоўга.

"*Усе перакрыцці і ўнутраныя сценкі ў нашай кватэры драўляныя*, — распавядае Аляксандр. — *Вады няма, вось, бачыце, на газе кіпяцім тую, што з калонкі прынеслі. Два аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі прынёс пажарны, але чамусьці не ўсталяваў. Я чакаў, чакаў і ўрэшце сам прыкруціў, спадзяюся, правільна*".

У дома моцна пашкоджаны фундамент, і заўважна дэфармуюцца сцены. У пакоях цёпла, нават горача, але адчуваецца вільгаць. Кажуць, прусакі і мышы тут звычайная праблема, аднак гаспадар кватэры з гонарам адзначае: нязваных гасцей у яго няма, бо дом пільнуюць кот і кошка.

Тэхнічная абсталяванасць дома, дзе з сям'ёй жыве Аляксандр, на мяжы фантастыкі. Мужчына просіць Івана прыглядзець за маленькай дачкой і праводзіць нас у пад'езд. Паказвае дагістарычны шчыток — жалезная зачыненая скрынка пад столлю. Правады ідуць наўпрост па сценах, побач жоўтыя разводы.

"*З даху цячэ, калі вельмі мокра*, — тлумачыць нам будаўнік. — *Здзіўляюся, што дагэтуль нічога не каратнула...*"

Не каратнула і добра — прыкладна такое меркаванне і ў мясцовых чыноўнікаў. Дамы па 1-й Праезнай не прызнаны аварыйнымі ці непрыдатнымі для жылля. Жыхары баракаў з тугой глядзяць за раку — там узрастаюць сучасныя навабуды. Быў спадзеў, што зямлю разам з баракамі выкупіць царква, што стаіць непадалёк. Але не зраслося, і жыхары дамоў па вуліцы працягваюць жыць у каларытным антуражы пазамінулага стагоддзя.

Марыя МАЛЕВІЧ.
Фота Сяргея ГРАБОЎСКАГА.

ЗАМЕСТ КАМЕНТАРЫЯ

Цікава, колькі б часу пратрымаліся ў такіх экстрэмальных умовах, напрыклад, старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр Аляксеевіч Кірычэнка ці дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Гомельскай-Юбілейнай выбарчай акрузе №31, у склад якой уваходзіць і 1-я Праезная вуліца, Дзмітрый Віктаравіч Фесак?

Ці для чыноўнікаў гэта неістотныя праблемы, дробязі?..

ДЫПКУР'ЕР

Экс-міністр абароны Украіны будзе працаваць у Беларусі?

Украіна накіравала ў Беларусь запыт на атрыманне папярэдняй згоды на прызначэнне Міхаіла Ежэля новым амбасадарам у нашай краіне.

Пра гэта паведамляюць украінскія СМІ, якія спасылаюцца на высокапастаўленую крыніцу ва ўкраінскім урадзе.

Цяпер месца Надзвычайнага і Паўнамоцнага Амбасадара Украіны ў Беларусі вольнае. 26 лістапада 2012 года прэзідэнт Віктар Януковіч звольніў з гэтай пасады Віктара Ціханава ў сувязі з абраннем яго народным дэпутатам Вярхоўнай Рады ў кастрычніку мінулага года.

Міхаіл Ежэль з сакавіка 2010 года да лютага 2012 года займаў пост міністра абароны Украіны. Уся дзейнасць Ежэля на пасадзе кіраўніка Мінабароны суправаджалася карупцыйнымі скандаламі.

КАШАЛЁК

Па іншай ведамасці

Некаторыя чыноўнікі атрымалі дадатак да заробкаў. Калі дакладней — тыя, хто прызначаны прадстаўніком дзяржавы ў камерцыйных прадпрыемствах, дзе ёсць дзяржаўны пакет акцый.

Указам Аляксандра Лукашэнкі нарматывы ўзнагароджання за нагляд над прадпрыемствамі для іх значна павышаны. Да 20 базавых велічынь у квартал — пры рэнтабельнасці прадпрыемства да 10 працэнтаў; да 25 базавых велічынь — пры рэнтабельнасці ад 10 да 15 працэнтаў; да 45 базавых велічынь — пры рэнтабельнасці ад 15 да 25 працэнтаў уключна; і да 55 базавых — пры рэнтабельнасці звыш 25 працэнтаў.

Самы вялікі дадатак да заробку атрымаюць тыя, хто прадстаўляе інтарэсы дзяржавы ў банках: нарматыў іх узнагароджання павышаны з 25 да 75 базавых велічынь у квартал. Нагадаем, што на дадзены момант базавая велічыня складае 100 тысяч беларускіх рублёў. Такім чынам, куратары банкаў атрымаюць да свайго заробку **7,5 мільёна рублёў**.

ДАРЭЧЫ

Літаральна напярэдадні падпісання ўказа Савет міністраў сваёй пастановай вызначыў, што віцэ-прэм'ер **Пётр Пракаповіч** будзе прадстаўляць інтарэсы дзяржавы ў ААТ "БПС-Сбербанк", віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы і міністр сельскай гаспадаркі **Леанід Заяц** — у ААТ "Белагрупрамбанк". Старшыня ўрада **Міхаіл Мясніковіч** "падзаробіць" у Банку развіцця, а першы віцэ-прэм'ер **Уладзімір Сямашка** — у "Прыорбанку".

Нагадаем, што многія вышэйшыя чыноўнікі прадстаўляюць дзяржаву не на адным, а адразу на некалькіх прадпрыемствах. Напрыклад, той жа **Міхаіл Русы** летам быў прызначаны назіраць за "Камунаркай". Так што "падработка" можа стаць сапраўды істотнай.

Усяго па даных на канец мінулага года ў акцыянерных таварыствы было прызначана 1119 прадстаўнікоў дзяржавы. Усе яны апынуцца ў ведамасцях на дадатковы заробак ад прадпрыемстваў.

Ігар МАРОЗАЎ.

SOS!

Віцябчане «забілі» амаль паўсотні качак

Днямі супрацоўнікі камунальных службаў знайшлі больш за 35 мёртвых птушак у вусці Віцьбы. Хутчэй за ўсё, у іх гібелі вінаваты жыхары абласнога цэнтра.

З вады мёртвых птушак разам даставалі прадстаўнікі МНС і камунальшчыкі — у горадзе ўпершыню сутыкаюцца з такой праблемай. Пакуль не скончаны ўсе даследаванні, нельга з упэўненасцю сказаць, што прывяло да гібелі птушак. Між тым асноўная версія — чалавечая жаласлівасць.

"Наўрад ці былі нейкія выкіды адходаў у ваду, — расказаў vitbichi.by начальнік Віцебскай гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **Валерый Фандо**. — *У сродках масавай інфармацыі неаднаразова папярэджвалі гараджан пра тое, каб качак не кармілі чорным хлебам. Я ўжо не кажу пра чыпсы, сухарыкі з прыправамі і іншыя падобныя прадукты. Таму, хутчэй за ўсё, прычына гібелі птушак — кармленне...*"

Сяргей ШЭЛЕСТ.

РЭГІЁНЫ

Самы смачны хлеб у краіне

Хлеб, што выпякае пенсіянерка ***Сцепаніда Аляксандраўна Лупач*** *з вёскі Дзеркаўшчына, што на Глыбоччыне, не проста прызнаны самым смачным — ён увайшоў у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.*

Сцепаніда Аляксандраўна ўсё жыццё лічылася выдатным пекарам. Яе мучныя стравы любілі ў сям'і, суседзі замаўлялі на святы, і нават раённае кіраўніцтва не грэбавала папрасіць жанчыну пачаставаць іх духмяным хлебам.

Рэцэпт хлеба, што стаў нацыянальнай спадчынай, пенсіянерка з Глыбоччыны зведала ад сваёй маці, і першы сакрэт яго — ніколі не пячы хлеб у дрэнным настроі.

"*Нараджэнне хлеба — заўсёды цуд!* — прызнавалася Сцепаніда Аляксандраўна vitnews.by. — *Галоўнае — мець цярпенне і любоў да справы, якую пачынаеш*".

Памірае завод

З сыравінай, тэхнікай, наладжаным рынкам збыту... Чаму? Людзі бягуць, бо не ведаюць, як выжыць на 200 долараў у месяц?

Коханаўскі льнозавод перажывае не лепшыя часы. Падаецца, ёсць з чым і для каго працаваць, але людзі бягуць з прадпрыемства. Нават адмовіліся ад трэцяй змены — няма каго ставіць да станкоў! Зараз сярэдні заробак на льнозаводзе 1.874.000 рублёў. Як за гэтыя грошы карміць сям'ю, як апранацца, плаціць за камунальныя паслугі? На прадпрыемстве разводзяць рукамі. Маўляў, партнёры грошай не вяртаюць, павінны каля мільярда рублёў. Кіраўніцтва спадзяецца на мадэрнізацыю, якая мусіць завяршыцца да 2015 года, а рабочыя працягваюць шукаць лепшай долі. Старэйшыя не вяртаюцца з адпачынку, маладзейшыя сыходзяць у дэкрэт ці ў армію. Калі так пойдзе і далей, то да завяршэння мадэрнізацыі працаваць на Коханаўскім ільнозаводзе не будзе каму...

Марыя МАЛЕВІЧ.

РЭДКІ ВЫПАДАК

Уваскрос!

Пазаўчора ў Мінску сваякі сустрэлі Мікалая Шпака, маючы на руках даведку, што ён памёр

...Позна вечарам перад вагонам №5 цягніка "Масква—Мінск" стаялі дзве жанчыны і ўглядаліся ў твары пасажыраў, якія прыехалі з расійскай сталіцы. Сярод іншых па прыступках вагона спусціўся невысокі мужчына сталага веку. Старэйшая жанчына паглядзела на яго і прамовіла: *"Не, не ён"*. А маладая задумалася... Мужчына хуценька пайшоў у бок вакзала. "Тата!!!" — раптам закрычала маладая дзяўчына і кінулася ўслед. Бацька і дачка абняліся і моўчкі заплакалі.

Мікалай Шпак некалі жыў у Мазыры. Але вось ужо другі год родныя лічылі яго памерлым. Гісторыя незвычайная. На жаль, сотні і сотні нашых суайчыннікаў, якія выязджаюць на заробкі ў Расію, трапляюць, можна сказаць, у палон. І Мікалая, калі верыць яго словам, напаткаў менавіта такі лёс.

2001 год... Праз 40 дзён пасля пахавання жонкі М.Шпак заявіў сваякам, што паедзе ў Расію на заробкі: маўляў, тут няма чаго рабіць, а там будаўнікам плацяць значна больш — вось і будзе магчымасць і самому пракарміцца, і дзецям дапамагчы. Пасля гэтага сваякі яго больш не бачылі.

Сястра Мікалая Шпака Святлана расказвае: *"Аніякіх звестак не было. Мы ж і заяву падалі ў міліцыю, і ў праграму на расійскі канал ГРТ "Жди меня" накіравалі фатаграфію і нашу заяўку. Але толькі цяпер зразумелі, што ніхто яго не шукаў ды і не збіраўся шукаць. Апошні раз мы атрымалі ад яго звестку ў 2004 годзе. Ён напісаў маці, што жывы, знаходзіцца ў Арэнбургскай вобласці. Мы па тым адрасе накіравалі яму сваю тэлеграму. Але адказу не атрымалі. Мінулі гады, і мы ўжо паверылі, што брата няма ў жывых. Праўда, не ведалі, дзе шукаць яго магілу..."*

У 2011 годзе загс прызнаў Мікалая Шпака памерлым і выдаў яго сваякам адпаведную даведку. Але некалькі дзён таму ў доме сястры "нябожчыка" пачуўся тэлефонны званок. Святлана не можа без слёз гаварыць пра гэта.

— *Нейкі мужчына запытаў, ці можна пазваць Віктара (гэта мой муж) альбо Святлану*, — расказвае яна. — *Я адказала, што Віктар ужо памёр, а я і ёсць Святлана. Тады ён мне паведаміў, што тэлефануе па просьбе майго брата Мікалая. Я анямела, не магла нічога сказаць. Мужчына паведаміў, што мой брат жывы, што яго ўтрымлівае на рыбнай ферме як раба былы палкоўнік МУС Расіі. Гэты мужчына, што патэлефанаваў (Віктар яго завуць) даваў нейкія лекі Мікалаю, калі той хварэў, і такім чынам даведаўся пра яго становішча. А яшчэ мужчына сказаў, што сам быў цяжка паранены ў Чачне і ведае, як гэта страшна трапіць у палон і не мець магчымасці даць нейкі знак родным.*

Пасля званка сваякам давялося вырашаць пытанне, як вярнуць Мікалая Шпака на радзіму. У яго ж не было ніякіх дакументаў, а па месцы жыхарства ён лічыўся нябожчыкам.

Пашукова-выратавальны **атрад "Анёл"** і наша консульства дапамаглі.

На мінскім вакзале Мікалай Шпак доўга не мог справіцца з хваляваннем, але потым распавёў:

— Я думаў, што больш ніколі не буду дома, не пабачу сваіх... Нават дагэтуль не магу паверыць, што так усё здарылася. Нават не магу пералічыць, колькі разоў мяне збівалі. У мяне выбіты зубы, у мяне быў пералом асновы чэрапа, у мяне былі зламаны рэбры... Ды я не адзін такі быў. Там людзі паміраюць ад хвароб ці ад пабояў. Што там робіцца, дык нават адразу і не распавядзеш усяго!

Хто ведае, можа і не зусім так усё было. Але галоўнае - чалавек вярнуўся на радзіму.

Мікалай ГРЫЦУК.

З сястрой.

ПАСВЕДЧАННЕ АБ СМЕРЦІ

СВИДЕТЕЛЬСТВО О СМЕРТИ

Народная Воля
http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2013 г.

ОФИЦИАЛЬНО

Мясникович готов разрешить валютное кредитование жилья

Премьер-министр Беларуси считает целесообразным разрешить валютное кредитование физических лиц на строительство жилья. Об этом он заявил на заседании Совета министров.

— Для строительства жилья полагаю целесообразным разрешить кредитование физических лиц в валюте. Прошу Национальный банк и коммерческие банки поддержать, — цитирует belta.by премьер-министра.

По его словам, в 2013 году объем средств населения, направляемый на строительство жилья, должен вырасти более чем на 15 трлн рублей.

— Без надлежащей кредитной поддержки по доступным процентным ставкам реализовать это будет просто невозможно, — подчеркнул он.

Как напоминает сайт infobank.by, валютное кредитование физических лиц было приостановлено Национальным банком в середине 2009 года, а в конце 2010 года выдавать валютные кредиты населению запретили окончательно. Решение было обосновано высоким уровнем риска по валютным кредитам.

ПАНТЭОН ГЕРОЯЎ

Колькі разоў перапісвалі беларускую гісторыю?

Не так даўно кіраўнік Міністэрства замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў сказаў: “Лішні раз падкрэсліваю рэальную небяспеку перапісваць гісторыю і рабіць свае гістарычныя подзвігі і гістарычныя прэтэнзіі інструментам у сённяшняй палітыцы”.

А колькі разоў перапісвалі беларускую гісторыю? І каму гэта выгадна?

Іна КУЛЕЙ, кіраўнік камітэта абароны рэпрэсаваных “Салідарнасць”:

— Я лічу, што гісторыя Беларусі перапісваецца заўсёды пад ідэалагічныя крытэрыі кіраўнікоў краіны. Перапісвалася наша гісторыя і для таго, каб вынішчыць беларушчыну, нацыянальную свядомасць і русіфікаваць насельніцтва. Напрыклад, я сама вывучала гісторыю, дзе расійскія цары, расійскія волаты былі важнейшымі за беларускіх. Мала аб гэтым выкладалі, і калі б не самаадукацыя, то і не ведала б, што беларуская гісторыя вельмі багатая і глыбокая. На маю думку, перапіс гісторыі выгадны аўтарытарным, дыктатарскім рэжымам, тым, хто хацеў бы трымаць народ, як Фаму няверуючага, бо, калі ты не адчуваеш каранёў, ты вельмі слабы, табой можна кіраваць, забіваць бізуном, можна дурыць галаву. Я думаю, што цяпер у нашай краіне такі самы час.

Ігар КУЗНЯЦОЎ, гісторык:

— Самы буйны перапіс гісторыі, які датычыцца цяперашняй тэрыторыі Беларусі, быў пасля 1917 года. Другі этап — гэта кароткі курс гісторыі ВКП(б) 1938 года. Таксама быў адпаведны курс гісторыі БССР у духу савецкай гістарыяграфіі. Потым ішоў перабудовачны перыяд, калі сапраўды ўсё змянялася. А затым адбылося чарговае перапісванне гісторыі, калі ў асноўным ізноў вярнуліся да савецкай гістарыяграфіі і таму да мяжы 2000 года ў Беларусі быў ўсталяваны савецкі варыянт гісторыі. Безумоўна, ёсць мадэрнізацыі, з’явіліся нейкія дакументы, але інтэрпрэтацыі ўсіх ключавых падзей, напрыклад рэпрэсій, адсутнічаюць альбо прадстаўлены двуматрыма абзацамі ў кантэксце таго, што любая дзяржава вядзе барацьбу супраць сваіх ворагаў, і савецкая дзяржава не была выключэннем... Перадваенныя гады, трактоўка пакта аб ненападзе 1939 года засталіся нязменнымі, як і пачатковы перыяд вайны, паражэнне Заходняй ваеннай акругі, перыяд акупацыі.

Таму сёння вывучаюць гісторыю не новай Беларусі, а савецкай. У нас, калі ўзяць навуковую сферу за 18 год, не аборонена ні воднай дысертацыі, якая была б прысвечана праблемам рэпрэсій, калабаракцый, звязаная з лёсам ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі. Яшчэ, на мой погляд, у нас мала пішуць навуковых прац, якія ацэньвалі б партызанскі рух і падполле ў перыяд акупацыі Беларусі. Карацей, плямаў яшчэ хапае...

Дзіяна СЕРАДЗЮК, студэнтка:

— Не думаю, што скажу нешта новае, але мне падаецца, што гісторыя з кожным новым кіраўніком дзяржавы хоча крыху, але змяняецца.

Вячаслаў КЕБІЧ, першы прэм’ер-міністр Беларусі:

— А хіба толькі гісторыя Беларусі перапісвалася? Па-мойму, гісторыя любой краіны перапісваецца пад новага лідара...

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі:

— Усё залежыць ад таго, хто піша гэтую гісторыю і з якой мэтай. Калі ёсць палітычны заказ, яна пішацца лёгка. Таму што гісторыя мінулых часоў можа толькі даследавацца, а ў нас яна не даследуецца, а пішацца. Вось у гэтым і розніца. Колькі будзе заказаў, столькі яна і будзе пісацца ці пад палітычную групу, ці пад чалавека, які знаходзіцца пры ўладзе.

У нас дадатковыя праблемы — гісторыя Беларусі вымяраецца ў лепшым выпадку перыядам Другой сусветнай вайны. А так лічыцца, што яна пачалася з 1994 года, калі Лукашэнку абралі прэзідэнтам краіны. Гэта такая блізарукасць — не бачыць далей за сваё праўленне і нейкія падзеі выкарыстоўваць ідэалагічна для свайго кіраўніцтва.

Андрэй КІШТЫМАЎ, гісторык:

— Давайце па пунктах. Першае маё меркаванне: не міністрам замежных спраў выказваць заклапочанасць, што адбываецца ў гістарычнай навуцы. Хай міністры займаюцца міжнароднымі адносінамі і дыпламатыяй. Інакш, калі яны будуць сябе кваліфікаваць і як гісторыкі, баюся, у іх не хопіць часу для сапраўды сур’ёзных міжнародных спраў. І, вяртаючыся да мінулага, яны, прабачце, заваляць тое, чым павінны займацца ў цяперашнім.

Але, каб ніхто мяне не абвінаваціў у абароне карпаратыўных гістарычных інтарэсаў, я хацеў бы запытаць у міністра, завочна, канешне, якую гісторыю ён мае на ўвазе? Беларускую, расійскую, сусветную? Калі бальшавікі прыйшлі да ўлады, вырашылі адкрыць новую старонку ў сусветнай гісторыі. Усё ж такі гэта адбылося ў Расійскай імперыі, і таму ёй варта аб гэтым задумацца. Таму што задача перапісу гісторыі ўпершыню была пастаўлена год 100 таму, і не ў Беларусі, а хутчэй на расійскіх прасторах, уключаючы, канешне, тое, што называлася нацыянальнымі ўскраінамі.

Аднак улічваючы, што заява міністра была сказана даволі туманна, не было названа канкрэтных імёнаў, прозвішчаў, я бы параіў міністру альбо ўдакладніць сваю пазіцыю і не казаць ні аб чым, альбо не выкарыстоўваць гэтую гістарычную дубіну ў сваіх палітычных, я нават сказаў бы, у дробнапалітычных мэтах...

Марына КРУЦІКАВА, юрыст па адукацыі:

— Мне падаецца, што сёння многія беларусы настолькі дрэнна ведаюць гісторыю, што проста не важна, колькі разоў яе перапісвалі...

Раман ВАСЮКОВІЧ.

ЗА РУЛЁМ

За машыну з салона — 15 тысяч долараў

У сакавіку на беларускім рынку пачнуць прадаваць Nissan Almera расійскай зборкі. Днямі афіцыйны дылер абвясціў кошты на гэтую мадэль. Для новай машыны не так ужо і шмат. Мяркуйце самі: у базавай камплектацыі Nissan Almera “а-ля рюс” будзе каштаваць ад 14.275 долараў, а ў максімальнай версіі аўтамабіль абыдзецца прыкладна ў 18.800 долараў. Прычым кошт на гэтыя аўтамабілі ў Расіі і ў Беларусі будзе аднолькавым.

Як паведамляюць інтэрнэт-сайты, у падкапотнай прасторы Nissan Almera будуць размяшчаць выключна 1,6-літровы бензінавы матор, скрынка перадач на выбар: 5-ступеньчатая “механіка” або 4-дыяпазонны “аўтамат”.

У базавай версіі Almera будзе камплектавацца франтальнымі падушкамі бяспекі, гідраўзмацняльнікам руля і электрашклопад’ёмнікамі. А ў максімальнай камплектацыі дадасца кандыцыянер, скураны руль, поўны электрапакет, MP3-магнітола і колавыя дыскі.

ТЫМ ЧАСАМ

Па даных Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, самымі прадаваемымі аўтамабілямі за мінулы год сталі Lada (2951 аўто), Volkswagen (2586) і Renault (2067).

Цікава, што аўтамабілі ўсё радзей купляюць фізічныя асобы. У мінулым годзе яны складалі ўсяго 46,7% пакупнікоў, а ў пазамінулым — 76,4%.

Эксперты адзначаюць, што беларускі пакупнік павярнуўся ад сваіх улюбёных красавераў і аўто сярэдняга класа да недарагіх машын B-класа, адзначае аўтамабільны сайт *auto.mail.ru.* А шмат хто наогул адмовіўся ад куплі аўтамабіля. Прычына простая: дабрабыт беларусаў не палепшыўся, а аўтамабілі, як ні круці, падаражэлі.

ПАЧАКАЕМ...

Аўтамабілі патаннеюць?

Падчас сустрэчы мэра Мінска Мікалая Ладуцькі з прадстаўнікамі буйных прадпрыемстваў старшыня Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі Сяргей Міхневіч заявіў, што неверагодны працэнт ПДВ душыць аўтабізнес у краіне.

“Мы гаворым аб гэтым кожны год. Па нашых разліках, увядзенне стаўкі ПДВ у 10% хаця б на некалькі гадоў знізіць кошт новых і патрыманых аўтамабіляў”, — цытуе Міхневіча выданне Auto.tut.by.

Выслухаўшы меркаванне аўтадылераў, **Мікалай Ладуцька** вырашыў арганізаваць пры Мінгарвыканкаме працоўную групу на чале з Сяргеем Міхневічам па распрацоўцы прапаноў для парламента.

Аліна ВЕТРАВА.

НОВАЯ ТЕМА

Сиделки

Что мы думаем о них

До поры до времени мы даже не знаем об их существовании. Сиделки, сиделицы, хожалки... Что-то старинное, из Толкового словаря Даля. А мы молоды, горделивы, и у нас другая лексика в ходу: тренд, бутик, дизайн... Но молодость — недостаток, который быстро проходит. Ты стал человеком зрелым, а твой ближайший родственник — немощным. И проблема на семью свалилась будто бы “вдруг”: что делать со стариком? Ему нужна ежедневная физическая помощь, а мы, родные, — мы не черствые, но страшно занятые. Времени нет. Нет времени. Тогда-то и вспоминаешь: есть такая древняя милосердная профессия — прислуга для больного. Срочно требуется сиделка!

Обращаешься к государству. В каждом районе столицы есть территориальный центр социального обслуживания населения. Сиделки, конечно, там нарасхват, но стоит попробовать встать в очередь.

Вскоре в дом пришла девушка. Мы удивились: сиделка — профессия не для молодых. И это по объективным причинам. Здесь не нужен азарт, творчество, мобильность. Напротив, терпение, милосердие, умудренность. Ну, и навыки ухода за слабым: принеси-подай, подними-подотри.

Помню, сидим, разговариваем и видим, как у сиделки наполняются слезами глаза. Ей, похоже, страшно. Бесплатная квартира в самом центре города, которая станет на время ее пристанищем, — это хорошо. Но жилье неухоженное... Вообще атмосфера в доме у любого глубокого старика тяжелая. Идет процесс распада, заканчивается жизнь, и это отражается даже на неодушевленных предметах. Девушка сжимает зубы, не хочет отвечать на личные вопросы... Что ж, мы постараемся наладить с ней отношения. А пока, к сожалению, в ней, видно, поднимается чувство протеста. “За что оказалась здесь, в доме, пропахшем лекарствами, у ложа больного?” — спрашивает, наверное, у своей судьбы. Почему не в дорогом офисе на проспекте, как мечтала?

Но у нас нет времени расспрашивать и утешать еще и сиделку. Для нас она просто нанятый персонал. Мы платим и хотим, чтобы человек выполнял свои обязанности как можно лучше. И даже раздражаемся, что личная составляющая работника так бросается в глаза. Нас бы устроил холодный профессионализм.

Конечно, в свои 27 сиделка не представляла, что старость так тяжела и некрасива. Что все тайное в организме человека становится явным: мочеиспускание, слюноотделение... Что дряхлый организм — это сплошное недержание. А квартира старика — это запахи, запахи... Но сиделка не имеет права быть брезгливой! Тем более белоручкой. Она должна быть отзывчивой и терпеливой. Подать таблетку, вынести судно. Все вымыть. И улыбаться, располагать к себе. Старику, доживающему, может быть, последние дни, нужны положительные эмоции. Мы (по личной договоренности) даем за это кров, сиделка бесплатно живет в нашей квартире. Еще сиделка питается с нашей бабушкой из одной кастрюльки, из одного холодильника — мы не против. Есть же и выгода.

Впрочем, любая нанятая сиделка — это терра инкогнито. Какой у нее характер, какие привычки? В душу-то сразу не заглянешь. Наша первая так демонстративно не шла с нами на личный контакт, так сторонилась личных разговоров, что мы, грешным делом, подумали, что у нее не все в порядке с биографией. Может, она побывала в местах не столь отдаленных? Позвонили в центр — нет, биографии работников проверяются официально. Что ж это за дичок такой?

